3 Showalter, E. The Female Malady: Women, Madness and English Culture, 1830–1980 / E. Showalter. – Great Britain: Virago Press, 2012. – 308 p.
4 Renard, V. “You Must Speak…”: Traumatic Memory and Crisis of Testi-mony in Pat Barker’s Regeneration Trilogy / V. Renard // Literaire Interferenties: Multilingual e-Journal for Literary Studies [Electronic resource]. – 2008. – Mode of access: http://www.interferenceslitteraires.be/node/75. – Date of access: 12.03.2014.
5 Barker, P. The Regeneration Trilogy / P. Barker. – Great Britain: Viking, 1996. – 592 p.
6 Faulks, S. Birdsong / S. Faulks. – Vintage U.K. Random House, 1994. – 503 p.

УДК 821.161.3`06-312.4

Я. А. ШЧОКІНА
(г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны)

# ЖАНРАВЫЯ МАДЫФІКАЦЫІ ДЭТЭКТЫЎНАГА РАМАНА Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ

Адной з галін прыгодніцкай літаратуры з’яўляецца дэтэктыўны жанр, які прадстаўлны шэрагам разнавіднасцей у сучаснай беларускай культурнай прасторы. У рэчышчы агульных вектараў руху літаратурнага працэсу, дзе назіраецца агульная тэндэнцыя да сінтэтычнасці жанравай структуры мастацкіх твораў, развіваецца і жанр дэтэктыва. У дадзеным артыкуле на матэрыяле сучасных мастацкіх тэкстаў даследуюцца магчымыя мадыфікацыі акрэсленага жанру, а таксама ступень выяўленасці асобных рыс іншых ідэйна-фармальных адзінак.

Вытокі міліцэйскага дэтэктыва знаходзяцца ў сацыяльна-бытавой прозе. Росшукамі ў такіх творах займаюцца прафесіяналы. Часам матэрыял для сюжэтаў давалі рэальныя злачынствы, што ўводзіла ў твор элементы дакументалістыкі. У дэтэктывах некаторых аўтараў асноўная сюжэтная лінія ўзмацняецца аналізам важных сацыяльных і маральных праблем, такіх як карупцыя сярод прадстаўнікоў улады, наркаманія і рэкет, дзейнасць злачынных груповак, маральны выбар героя. Забарона ў Беларусі прыватных дэтэктыўных агенцтваў паўплывала на развіццё жанру і абумовіла яго мадыфікацыі, найперш на персанажным узроўні. Нягледзячы на гэта, з’явіўся шэраг тэкстаў, дзе вышукнікам выступае следчы-аматар.

Жанру міліцэйскага дэтэктыва адпавядае раман М. Чаргінца “Смерць за смерць” (2003), што абумоўлівае тып галоўнага дзеючага персанажа. Гэта прадстаўнік адзначанай прафесіі, спецыяліст у сваёй справе. У рамане М. Чаргінца такім героем выступае маёр міліцыі Павал Шрубянкоў, загадчык аддзела па барацьбе з наркабізнесам невялікага беларускага гарадка Рэчанска. Аўтар надзяляе свайго героя станоўчымі чалавечымі якасцямі: упэўненасцю, разважлівасцю, розумам, трываласцю, вернасцю справе і сваім маральна-этычным прынцыпам. Маёрам кіруе жаданне пазбавіць горад ад наркотыкаў, што паступова “забіваюць” мясцовае насельніцтва, і прага помсты забойцам яго начальніка і сябра. Шрубянкоў апісаны і як добры і верны сябра. Калі яго аддзел трапляе ў засаду, ён да апошняга спрабуе выратаваць старога таварыша Міхалыча.

Побач з галоўным героем дзейнічае яшчэ адзін персанаж – Раман Зайцаў, сын забітага капітана Міхалыча. Вобраз юнака таксама надзелены выключна станоўчымі рысамі. Стойкія жыццёвыя прынцыпы прымушаюць дзейнічаць героя згодна з устаноўкамі сумлення. Трэба адзначыць, што смерць бацькі рэзка мяняе характар паводзін хлопца. Жадаючы адпомсціць, Раман пераступае мяжу закона і пачынае самавольна караць бандытаў. Аднак адчай і туга, якімі матываваны ўчынкі героя, выклікаюць у чытача хутчэй спачуванне, чым асуджэнне яго дзеянняў. Юнак больш за астатніх разважае над глыбіннымі прычынамі тых праблем

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

грамадства, што звязаны з імкненнем суайчыннікаў да матэрыяльных набыткаў і новых крыніц задавальнення: *“Роман некоторое время стоял у заграничного чуда [машины. – Я. Ш.] и думал: «Вот за такие вещи, за деньги они готовы убить весь свой народ. Пусть люди превращаются в бродяг, отбросы, пусть у них рождаются уроды, пусть гибнут молоденькие девочки, ребятишки – этим подонкам всё равно. Они наживаются на людском горе, отравляют жизнь всем, а сами жируют, насилуют, убивают. Государство бессильно – подкуп, шантаж разваливают всю государственную систему, и никто, никто не может остановить их»”* [1, с. 461].

Сустрэча абодвух герояў – Рамана Зверава і Паўла Шрубянкова – становіцца выпрабаваннем для апошняга і актывізуе адвечную праблему выбару. Маёр павінен вырашыць, ці здольны ён перайсці тую мяжу, якая падзяляе закон і самасуд: *“С одной стороны, как майор милиции, он [Павел Шрубенков. – Я. Ш.] должен задержать убийцу, но с другой стороны… По-человечески он понимал Зверева. Не оправдывал, но понимал. Дай ему волю, Павел и сам бы перестрелял всех этих сволочей, что торговали «белой смертью» и заполонили все улицы и заведения города”* [1, с. 482]. Міліцыянер вырашае дзеля сябе не адыходзіць ад літары закону, але і не адмаўляецца ад дапамогі Рамана, якая па сутнасці сваёй з’яўляецца злачыннай.

Персаніфікаваным увасабленнем Ліха ў рамане з’яўляюцца канкрэтныя асобы, багацеі невялікага гарадка Рэчанска: алігарх Парамонаў і яго памочнік Ляўша, адвакат Рубельман і мясцовы аўтарытэт па мянушцы Алтын. Менавіта супраць іх змагаецца галоўны герой і яго каманда. У канцы рамана, як і належыць дэтэктыву, бандыты аказваюцца параможанымі, нягледзячы на ўсе хітрыкі і пагрозы. Аднак драматычна складваецца і лёс Рамана. Чытач адчувае, што пачуццё вялікай тугі па прычыне смерці бацькі не дасць юнаку шанец на нармальнае, спакойнае жыццё. Акрамя таго, самасуды, якія вяршыў Раман, павінны быць пакараны, згодна з пафасам справядлівасці, якім прасякнуты твор. Смерць юнака ў такой сітуацыі падаецца збаўленнем ад пакут рэальнага жыцця і кары ўладаў.

Раман Н. Бабінай “Рыбін горад” (2007) таксама ўтрымлівае элементы міліцэйскага дэтэктыва: галоўная гераіня Ала сутыкаецца з бандытамі, якія любымі сродкамі хочуць адабраць у жанчыны зямлю яе бабулі Макрыні. Злодзеі пачынаюць з пагроз уласна самой Але і заканчваюць абяцаннем забіць дзяцей яе і яе сястры, калі гераіня не падпіша ўсе дакументы. Аднак гэта толькі адзін з пластоў узгаданага твора і самы лёгка расчытваемы. У твор таксама ўводзіцца своеасаблівы фантастычны элемент: Ала адкрыла ў сабе здольнасць знаходзіць так званыя “норы” ў часе. “Норы” – даволі спецыфічная з’ява: яны адкрываюцца толькі канкрэтнаму чалавеку (галоўнай гераіні), выключна ў моманты вялікіх эмацыянальных зрухаў і паказваюць жыццё толькі бабы Макрыні, сваячкі Алы. Паказальным з’яўляецца эпізод з сынам бабкі Макрыні, які меў шэсць пальцаў на назе, і сяляне вытлумачылі гэта не як фізічную асаблівасць, а як пазнаку д’ябла. Непісьменнасць, прымхлівасць, адсутнасць адукацыі і асветы прымушаюць людзей тлумачыць незразумелыя з’явы праз логіку міфалагічнага мыслення. Выкарыстанне міфапаэтычных вобразаў з народных вераванняў дапамагае гераіні ў вырашэнні праблем сённяшніх. Так, распавядаючы пра сустрэчу з чортам, яна прапануе свой уласны метад барацьбы з ім. Сітуацыя спрацоўвае і пры сустрэчы з Кукалем: Ала пабіла яго анучай са сваёй уласнай крывёю. Аўтарка не дае дакладнага тлумачэння, чым з’яўляліся гэтыя “норы” – галюцынацыяй галоўнай гераіні, якая хварэе на алкагалізм, або анамаліямі ў часава-прасторавай тканіне Сусвету, што ўзніклі пад уздзеяннем моцных эмацыянальных перажываннем продкаў Алы. Наяўнасць “нор” у часе ў сюжэтнай канве аповеду прыўносіць элементы містычнага ў дэтэктыў.

Не меншы ўдзел містычнага пачатку назіраецца ў дэтэктыве Н. Харытанюк “Смерць лесбіянкі” (2013). Рэальнае забойства шчыльна пераплятаецца з прымхлівымі забабонамі галоўнай гераіні, якая шчыра верыць у праклён, насланы на яе невядомай старой па

тэлефоне. Па сутнасці, галоўная гераіня прымае пасіўны ўдзел у раскрыцці злачынства, яна вытлумачае падзеі згодна са сваёй верай у міфалагічнае, у пачвару, што жыве ў лёхах Полацкага ўніверсітэта, а таксама ўпэўненасцю, што менавіта яна павінна была стаць ахвярай забойцы з прычыны праклёну, які хутка павінен здзейсніцца. У рамане яскрава апісаны моманты блытаніны свядомасці гераіні, блізкія да галюцынацый. Росшукі забойцы вядуцца пад містычным ціскам мясцовай легенды пра праклён, які абяцае смерць кожнаму, хто патрапіць ў полацкія лёхі. Нават следчы спрабуе вывесці гэтую тэорыю ў якасці асноўнай пры даследаванні справы.

Пісьменніца ўступае ў своеасаблівую гульню з чытачом: стварае займальны сюжэт з забойствам, “смяротнай легендай” і вобразам сіняй пачвары, прымушаючы чытача засумнявацца ў магчымасці рэальнага вытлумачэння забойства, а потым у фінале абвяшчае ўсё вышэйапісанае снабачаннем стомленай гераіні, тым самым падманваючы чаканні рэцыпіента. Аднак канцоўка застаецца адкрытай, бо прачнуўшыся, гераіня вяртаецца да пачатку падзей, якія паўтараюць малюнкі з яе сну.

Тэндэнцыя да рамантызацыі ў галіне гістарычнай прозы прывяла да фарміравання такой мастацкай з’явы, як гістарычны дэтэктыў, што валодае прынцыповымі адрозненнямі ад дэтэктываў масавай літаратуры. У такіх творах, як сцвярджае А. Бязлепкіна, “матывам забойства рабілася не звыклая трыяда «страх – помста – грошы», а пытанні ідэалагічныя, звязаныя з праблемамі фарміравання нацыянальнай свядомасці” [2, с. 283]. Яркім узорам гэтага жанру з’яўляецца раман Л. Рублеўскай “Сутарэнні Ромула” (2011).

Дзеянне ў рамане разгортваецца ў двух часавых пластах: сучаснасці і пачатку мінулага стагоддзя. Сюжэтам “Сутарэнняў Ромула” становіцца гісторыя кахання і нянавісці. Падзеі пачынаюцца з нечаканага парушэння звыклага ходу жыцця рэдактаркі Арсеніі Вяжэвіч з’яўленнем даўняга знаёмца, пісьменніка Вячкі Скрыніча, які прапануе дзяўчыне дзіўную авантуру: пражыць напісаны ім раман, з сюжэтам якога яна будзе знаёміцца пакрова. Твор Скрыніча пабудаваны на адлюстраванні напружаных стасункаў прадстаўнікоў двух родаў: Вяжэвічаў і Корб-Варановічаў. З мэтай увасобіць сюжэт у рэчаіснасць, Вячка “ўцягвае” ў гульню апошняга прадстаўніка роду Варановічаў Данілу.

Арганізуючая роля ў творы належыць матыву сустрэчы герояў, які многімі момантамі супадае з часам рыцарскага рамана, як яго апісаў М. Бахцін, калі герой перажывае “цудоўныя прыгоды, цікавыя (і прывабныя) для яго самога” [3, с. 303]. Парыву шалёнай жарсці, які кідае прадстаўнікоў варагуючых родаў у абдымкі адзін да аднаго, лагічна папярэднічае сустрэча, на пачатку якой Даніла і Арсенія адчуваюць узаемнае напружанне, што прымаюць за спадчынную нянавісць. Складаныя адносіны нашчадкаў Вяжэвічаў і Корб-Варановічаў, радаводы якіх, як становіцца вядома пазней, паходзяць з аднаго кораня, з’яўляюцца тым самым стрыжнем, на які “нанізваюцца” разнастайныя часткі тэксту, дзе ўзгадваюцца прадстаўнікі абодвух родаў, шляхі іх перакрыжоўваюцца ў розныя гістарычныя эпохі. Часта ў такіх эпізадычных згадках фігуруе вобраз падземнай царквы і звязаная з ім легенда пра двух братоў: Юрыя і Язэпа Корб-Варановічаў.

Апісваючы сітуацыю няпростых стасункаў родных братоў, пісьменніца апелюе да старажытнарымскага падання пра Ромула і Рэма, што заснавалі вечны горад. Старажытны Рым узгадваецца і ў 11-м раздзеле твора, які называецца “Закон Януса”, дзе Л. Рублеўская параўноўвае сацыяльнае напружанне часоў рымскай імперыі і трывожна-дэпрэсіўны стан людзей эпохі сталінскіх рэпрэсій, калі яны вымушаны былі “*мець адзін твар – для дому, другі – для грамадства*” [4, с. 418].

Падзеі пачатку мінулага стагоддзя падаюцца праз суб’ектыўнае ўспрыняцце Алеся Вяжэвіча, а сучасныя прыгоды прапускаюцца праз прызму свядомасці ягонага нашчадка – Арсеніі, вобраз якой з’яўляецца дакладнай копіяй нязменнай галоўнай гераіні раманаў і аповесцяў пісьменніцы. Ася Вяжэвіч атрымлівае ў тэксце цэлы набор характэрных рыс,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сярод якіх – выхаванне ў чыста жаночай сям'і, у кожнай прадстаўніцы якой па розных прычынах не склалася асабістае жыццё. Сама дзяўчына таксама не мела ў мінулым станоўчых адносін з прадстаўнікамі супрацьлеглага полу. У сітуацыі з разгадкай галоўнай таямніцы спрацоўвае традыцыйная схема авантурнага рамана, і разгадка знаходзіцца дзякуючы выпадковасці. Арсенія літаральна правальваецца ў падземную царкву, сутарэнні якой часткова разбурыліся з-за бутафорскіх выбухаў кіношнікаў, што здымалі недалёка ад гэтага месца фільм пра вайну.

К. Кушнарова заўважае: "Супастаўляючы паводзіны людзей у розныя гістарычныя эпохі, Л. Рублеўская не толькі паказвае ўласцівыя сучасным людзям перакананні і манеры паводзін, але ў большай ступені выяўляе ўніверсальныя канстанты быцця, уласцівыя ўсім часам" [5, с. 84]. Мусім пагадзіцца з даследчыцай, бо героі рамана выяўляюць непарушную вернасць Радзіме, шануюць продкаў і гістарычную памяць народа, страта якой пагражае пазбаўленнем аўтэнтычнасці нацыі. І. Шаўлякова зазначае, што "сімвалічная сутнасць канфліктаў у аповесцях і раманах Л. Рублеўскай выяўляецца праз сутыкненне годнай, ахвярнай мінуўшчыны і прагматычнай, сквапна-драпежніцкай сучаснасці" [6, с. 6]. Апошняй амаль заўсёды даецца шанец на духоўнае ачышчэнне: мёртвыя ратуюць жывых, дапамагаючы пабудаваць свае паводзіны суадносна з законамі сумлення.

Элементы дэтэктыва прасочваюцца ў "паралельным рамане" "Золата забытых магіл" (2004). Героі сутыкаюцца з таямніцай роду Рашчынскіх, схаванай у надмагільнай кампазіцыі фігур, і кідаюць усе высілкі і веды на разгадку. Сюжэт утрымлівае рысы крымінальнага дэтэктыва. Пачынаецца гісторыя с забойства маладога вучонага і алкаголіка Артура, якое цягне за сабой махлярства з дакументамі на маёмасць, напад бандытаў, якія прадставіліся спецназам. У сваю чаргу, пошукі скарбу і наяўнасць мапы, якая прывяла ўсіх да месца, сведчаць пра наяўнасць рыс прыгодніцкага рамана. Беларускім гістарычным дэтэктывам уласціва пэўная ірацыянальнасць, містычнае вырашэнне дзеяння; да традыцыйнай трыяды матываў злачынстваў (грошы – страх – помста) дадаецца, як было зазначана вышэй, злачынства за ідэю, хаця ў дадзеным творы яны звязаны непарыўна: знайсці скарб зможа толькі шчыры патрыёт беларускай зямлі, знаёмы з яе гісторыяй і культурай. Ключом для разгадкі шыфру надмагілля з'яўляецца сакрэтнае вітанне паўстанцаў "Каго любіш? – Беларусь! – То ўзаемна!".

У творы "Сутарэнні Ромула" Л. Рублеўская арганічна спалучае асветніцкія мэты з займальнасцю выкладу, гераічны пафас – з напружанай інтрыгай. Героі шануюць маральныя-этычныя каштоўнасці продкаў, а загадка падземнай царквы надае твору таямнічасць. Вышэйназваныя рысы сведчаць, што раман належыць да рамантычнага гістарычнага дэтэктыва.

У рамане Л. Рублеўскай "Золата забытых магіл" нельга не заўважыць адпаведнасць адной часткі твора такой разнавіднасці жанру дамскага рамана, як жаночы дэтэктыў, што мае дачыненне да паралітаратуры, асноўная мэта якой – любымі сродкамі прыцягнуць увагу чытачоў, таму такі тып гераіні – з дзівацтвамі і з неўладкаваным асабістым жыццём – павінен зацікавіць шырокую жаночую аўдыторыю. Прысутнічае ў сюжэце і лінія кахання. Наяўнасць трох кандыдатаў на сэрца Паліны з'яўляецца алюзіяй на старыя добрыя казкі, у якіх прынцэса (царэўна, каралеўна) з трох мужчын выбірала апошняга Івана-дурня, адкінуўшы два больш прывабныя, на першы погляд, варыянты. Паводзіны маладой жанчыны адпавядаюць прыкладна гэтай жа схеме: яна дае адмоўны адказ на прапанову мужа, які абяцаў заможнае жыццё за мяжой; не жадае пабрацца шлюбам з былым штурманам Сымонам, які мог абараніць ад нягод. Паліна і сама цудоўна разумее ўсю абсурднасць сітуацыі: "*На стале апынуліся побач літровы слоік з шыпшынавым варэннем ад Сымона і бюст Рашчынскага, злеплены Валянцінам. Цікавая інсталяцыя! Паліна прынесла з лядоўні Стасеву тэкілу – шыкоўная выгінастая бутэлька з залатымі налепкамі, і таксама паставіла на стол. Тры*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*падарункі для прынцэсы… Чый лепшы? З кім быць прынцэсе?*” [7, с. 144]. З інтрыгуючага чатырохкутніка “прынцэса” Паліна абірае свайго “прынца” Валянціна, які найбольш падыхоць духоўна гераіні твора, валодаючы пры гэтым прыемнай знешнасцю і мужным характарам. Аповед вядзецца ад першай асобы, таму чытач атрымлівае інфармацыю праз прызму адметнага жаночага ўспрыняцця, для якога характэрна пачуццёвасць, эмацыйнасць, разважлівасць і задуменнасць.

У рамане-парафразе В. Куртаніч “Залюстрэчча для Алісы” (2003) таксама, як і ў творы “Золата забытых магіл” Л. Рублеўскай, сустракаюцца рысы жаночага дэтэктыва. Падзеі ў творы таксама падаюцца праз успрыняцце галоўнай гераіні, але ўжо вуснамі аўтара-апавядальніка. У цэнтры рамана – маладая жанчына Аліса, якая знаходзіцца ў стане дэпрэсіі пасля разводу з мужам, матэрыяльна забяспечаным бізнесменам Сымонам. Згодна з канонамі жанру, гераіня валодае знешнім хараством: *“Мне было дваццаць два гады, і пры ўважлівым аглядзе можна ўпэўніцца, што гады шлюбу не сапсавалі ані твару, ані фігуры; бляск недаспаных вачэй, худзіна, што прыкінулася, як хвароба, ад ляжання на нечакана мулкім ложку, нездаровы румянец яшчэ больш зрабілі мяне падобнай да Шэран Стоўн”* [8, с. 5–6]. Адпаведна апісанай вышэй схеме любоўных раманаў, павінен з’явіцца Ён – ідэальны прыгажун з чыстым сэрцам. Менавіта такімі рысамі надзелены Дзям’ян, які аднойчы раніцай падвозіць прыгажуню да працы. Аднак аўтарка адмаўляецца ад сюжэтнай запраграмаванасці жанру, і любоўныя адносіны Алісы і Дзям’яна заканчваюцца трагічна: юнак памірае ад цяжкай спадчыннай хваробы.

Такім чынам, жанр дэтэктыва ў беларускай культурнай прасторы прадстаўлены шэрагам субжанраў. Міліцэйскі дэтэктыў прытрымліваецца класічнай схемы сюжэтабудовы, а таксама выбару персанажа. Блізкі да яго шпіёнскі дэтэктыў прадстаўлены толькі як частка сінтэтычнага па сваёй структуры твора. Шырокую папулярнасць у чытачоў атрымаў гістарычны дэтэктыў, які знаходзіцца на скрыжаванні некалькіх жанраў, што знаходзяцца ў цеснай сувязі і ўзаемаабумоўліваюць мадыфікацыю асобных сваіх рыс. Акрамя ўласна мастацкіх, гэтыя тэксты выконваюць пазалітаратурныя функцыі: працягваючы рамантызаваць гісторыю краіны, супрацьпастаўляюць шляхецкую Беларусь рабочай і сялянскай, міфалагізуюць мінулае. Некаторыя субжанравыя адзінкі, такія як жаночы і містычны дэтэктывы, на дадзены момант не набылі належнай увагі і выяўляюцца толькі ў асобных прыёмах, выкарыстаных для стварэння займальнасці.

**Спіс літаратуры**


1 Карона Вітаўта Вялікага: раманы, аповесці, апавяданні. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2004. – 510 с.

2 Бязлепкіна, А. Эвалюцыя гістарычнай прозы ў беларускай літаратуры: ад рамантычных твораў да альтэрнатыўнай гісторыі / А. Бязлепкіна // Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах, міжнародныя навуковыя чытанні, 7–8 кастрычніка 2010. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2010. – 372 с.

3 Бахтин, М. Эстетика словесного творчества / М. Бахтин. – М.: Искусство, 1979. – 423 с.

4 Рублеўская, Л. Сутарэнні Ромула: раманы / Л. Рублеўская. – Мінск: Кнігазбор, 2012. – 520 с.

5 Кушнарова, К. Катэгорыя часу ў рамане Л. Рублеўскай “Сутарэнні Ромула” / К. Кушнарова // Христианский гуманизм и его традиции в славянской культуры. Выпуск 3. Гомель, 2011 г. – С. 82–85.

6 Шаўлякова, І. Міфалогія вяртання. Беларуская проза першага дзесяцігоддзя XXI ст. / І. Шаўлякова // ЛіМ. – 2011. – 6 мая (№ 18). – С. 6.

7 Рублеўская, Л. Пярсцёнак апошняга імператара: раман, аповесць, апавяданні / Людміла Рублеўская. – Мінск. : Маст. літ., 2005. – 276 с.

8 Куртаніч, В. Залюстрэчча для Алісы: Раман-парафраз, аповесці, п’еса, апавяданне / В. Куртаніч. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2003. – 312 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ